**Кузьмінова Л.А. (Мядзел)**

## Цвёрдыя жанравыя формы (санет, рубаі, танка, хоку) у творчасці Максіма Танка

Яркім святлом на небасхіле беларускай літаратуры ззяла зорка Максіма Танка. Вядома, што імя М. Танка найперш асацыіруецца з верлібрам, аднак паэт абсалютна натуральна пачуваў сябе і ў цвёрдых вершаваных формах – **санет, танка, рубаі, хоку.** Зварот да такіх вершаваных формаў паказвае, што паэт не баяўся эксперыментаваць, знаходзіўся ўвесь час у творчым пошуку.

Яшчэ ў даверасьнёўскі перыяд М. Танк піша санет “Заснула казка на акне маім астрожным…” У першай частцы гэтага твора герой, разглядаючы ўзоры, якія намаляваў мароз на шкле цямніцы, бачыць у іх родны лес:

Звяры там разам з лесуном пужаюць падарожных,
Там вадзянік жыве ў глыбі азёр,
Чараўніком прыкуты да скалы арол... [3, с. 34]

Нельга не заўважыць міфалагізацыі мыслення аўтара. Міфалагізацыя надае твору нейкую незвычайную атмасферу, таямнічасць і ў той жа час трагічнае гучанне. Герой знаходзіцца за кратамі, не мае магчымасці пакінуць астрог, і быццам у паўсне ўяўляюцца яму карціны роднага краю. Прырода ў паэта нясе рысы адушаўлёнасці: мае жывы голас. Як пра жывую піша аўтар пра казку: казка заснула, казка серабрыцца. М. Танк выяўляе зайздросную глыбіню і праніклівасць назіранняў, ён надзіва дасканалы ў сваіх зрокавых параўнаннях і асацыяцыях.

У пазнейшай творчасці, а дакладней ў зборніку “Дарога, закалыханая жытам”, знаходзім “Антысанет”, дзе М. Танк вядзе размову пра паэзію. Ён задаецца пытаннем:

Што сваёй Музе рупнай, працавітай
Я падару на схіле сваіх лет? [3, с. 66]

Можа, гэта будзе ранет, прынесены з райскага дрэва; а можа, пярсцёнак Палікрата; чара, поўная блакіту; а можа, ён прыбярэ сваю гарэзу ў санет? Санет ён параўноўвае з вопраткай старажытных багіняў. Вопратка гэта вельмі прывабная, яна да твару яго Музе, але ў той жа час ёй цесна ў рамках санета. Гэтым аўтар указвае на шырыню свайго творчага дыяпазону, неўтаймаваную натуру, на тое, што яго вабяць новыя даляглялы і замыкацца ў чатырнаццаці радках яму недаспадобы.

У гэтым жа зборніку знаходзім яшчэ адзін санет “У век рэвалюцыйны, штармавы…”, датаваны 1973 г. У творы зноў у полі зроку аўтара – тэма паэта і паэзіі. Ён параўноўвае паэзію з ветразем, і, як і даўнія мастакі, задумвае

Адправіцца на караблі санета
На дальнія сузор’яў астравы [3, с. 28].

Паэт гаворыць пра тое, што зараз ідзе перабудова свету, чалавецтва штурмуе касмічныя прасторы, людзі імкнуцца авалодаць новымі ведамі, і ён не мае права заставацца ў баку ад гэтых перамен. Перамены патрэбны і ў паэзіі. Нельга спыняцца на дасягнутым, патрэбна ўвесь час ісці наперад, спрабаваць свае сілы ў розных формах вершаскладання. Нястомна і няспынна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

шукае паэт сваіх шляхоў да новага і нязнанага, пільна прыглядаецца да самых розных плыняў і напрамкаў. Ён імкнецца быць простым і зразумелым усім, хто дакранецца да яго паэзіі, і разам з тым імкнецца да незвычайнага вобраза, да новых і нечаканых рашэнняў.

Аўтар як бы ўступае ў спрэчку з тымі, хто сумняваецца, што яму ўдасца авалодаць майстэрствам санета:

Не верыце, што я ажыццяўлю
Намер свой і вярнуся на зямлю,
Што вытрымаюць ветразі і ванты? [3, с. 28]

Паэт ведае, што санет ужо вытрымаў выпрабаванне часам, бо яго складаў у далёкай мінуўшчыне Дантэ, а затым іх ствараў і сам Шэкспір – прызнаны майстар санета:

Наіўныя! Мой карабель – санет
Калісьці збудаваў вялікі Дантэ,
А сам Шэкспір на ім адкрыў сусвет [3, с. 28].

На працягу жыцця М. Танк многа падарожнічаў, аб’ездзіў не толькі Савецкі Саюз, а пабываў і ў самых розных краінах свету. Пад уражаннем убачанага і пачутага ствараліся многія вершы. Так, пасля наведвання Казахстана з’яўляецца верш “На радзіме Абая”, прысвечаны вядомаму казахскаму паэту Абаю Кунанбаеву. Верш напісаны ў форме **рубаі** – адной з самых распаўсюджаных форм лірычнай паэзіі народаў Блізкага і Сярэдняга Усходу, Сярэдняй і Паўднёва-Усходняй Азіі. Запазычана рубаі з вуснай народнай творчасці таджыкаў і персаў, уяўляе сабой чатырохрадкоўе з рыфмай *ааба.* М. Танк пашырыў жанравы дыяпазон і стварыў **адычнае рубаі**, якое складаецца з сямі чатырохрадкоўяў, у якіх паэт услаўляе выдатнага прадстаўніка казахскага народа. М. Танк упэўнены, што Абай несмяротны, што яшчэ і сёння песня яго звініць “на прасторах палёў і аснежаных гор”, не толькі на радзіме, але і далёка за яе межамі:

Ад вяршынь Ала-Тау да Балтыкі хваль
На ўсіх мовах гучыць горда імя яго [3, с. 10].

У апошніх радках паэт услаўляе ўвесь край, “край братоў, край песняра – Казахстан”:

Над зямлёй серабрыцца празрысты туман.
Стэп, як вытканы з казак, як з песень дыван.
О, якой непаўторнай красою цвіцеш,
Край братоў маіх, край песняра – Казахстан!
Як я рад, што з сабой павязу я дары
Ў сэрцы : подыхі стэпу і пурпур зары,
Успаміны сустрэч, срэбны звон арыкоў
І цяпло вашых рук, дарагія сябры! [3, с. 11]

Не пакінуў без увагі Максім Танк і паэзію Японіі – адным з першых звярнуўся да нязвыклых беларускаму чытачу жанраў. Ён пакінуў у спадчыну сваё разуменне японскай паэзіі, свабодную трактоўку **танка** і **хоку.** Гэтыя вершаваныя формы напісаны адвольным памерам, некаторыя з іх створаны на японскім матэрыяле. Розныя тэмы характэрны для танкі: каханне,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прырода, разлука, падарожжы. Любая падзея ці здарэнне, любое перажыванне, любая эмоцыя могуць стаць асновай для танку:

Усе рэкі бяруць свой пачатак,
Усе дрэвы сваю свежасць,
Усе хмары свае бліскавіцы,
Усе вятры свае сілы – з крыніц.
Толькі песні – з сэрца [3, с. 53].

У гэтым творы аўтар зноў скіроўвае погляд на паэзію. Ён сцвярджае неразлучнасць паэзіі і роднай зямлі, бо менавіта зямля жывіць сваёй сілай сапраўдную творчасць. Але паэзія не можа існаваць, калі яна не прайшла праз сэрца самога аўтара, не закранула струны яго душы.

Маўчанне
Ніколі не было
І не будзе золатам:
Яно – або
У шмат разоў даражэйшае.
Або – нічога не вартае [3, с. 42].

**Хоку** – гэта верш-намёк, паэтычны малюнак, створаны адным-двума штрыхамі. Часцей за ўсё хоку – гэта лірычны верш пра прыроду. Гэта не проста паэтычная форма, а пэўны спосаб мыслення, своеасаблівае бачанне свету. Узнікла гэта форма прыкладна ў XV–XVII стст., складаецца з трох нерыфмаваных радкоў і сямнаццаці складоў па ўзору 5 – 7 – 5, але галоўная прыкмета хоку – глыбокі змест.

Неразлучнымі
толькі пакінуў нам Буда
Жыццё і Смерць [3, с. 317].

Максім Танк – наватар у паэзіі. Ён не баяўся эксперыментаваць, шукаць новыя формы і жанры, аднак усюды паказваў узоры змястоўнай паэзіі, гранічнай яснасці думкі, у яго заўсёды на першым месцы быў сэнс. Як зазначае А. Кучар, “верш Танка нельга дапоўніць дадатковымі строфамі або скараціць. Толькі самыя абавязковыя радкі, тыя, што рухаюць думку наперад, складаюць верш” [2, с. 34]. Нельга не пагадзіцца і з думкай А. Бельскага: “Такія паэты, як М. Танк, пасланы Богам на нашу зямлю, каб мы адчулі і зразумелі мову ручая і дажджу, травы і дрэва, святло сонца і зорнага неба, адкрылі для сябе,што без прыгажосці нельга існаваць ні на гэтай зямлі, ні ў Сусвеце” [1, с. 135].

Літаратура

1. Бельскі, А. Пясняр і абаронца роднай прыроды / А. Бельскі / Краса і смутак. – Мінск, 2000.
2. Кучар, А. Максім Танк / А. Кучар / Літаратурна-крытычныя артыкулы. – Мінск, 1980.
3. Танк, М. Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Беларус. навука, 2006–2012.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ